

16 красавіка,

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

**31 КАНАЛ**

Анонс лепшых фільмаў на кожны дзень.

**«...Год працы «Звязды» на беларускай мове паказаў, што палітыка, якая праводзіцца партыяй у галіне беларусізацыі, з'яўляецца, безумоўна, правільнай...»** СТАР. 6



**Сёлета ў сталіцы толькі ў студзені несанкцыянаваныя надпісы былі зафарбаваны на 188 будынках, што каштавала гарадскім уладам 6,1 млн.** СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 КРАСАВІКА 2012 г. ПЯТНІЦА № 72 (27187) Кошт 1100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## БЕЗ РОСТУ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ НЕ БУДЗЕ ПАВЫШЭННЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ

Аб гэтым ён заявіў учора, наведваючы з рабочай паездкай Гомельскую вобласць.

«Апошнім часам назіраю, у тым ліку і праз сродкі масавай інфармацыі, што ўсё больш і больш працоўныя калектывы і людзі ўзнімаюць пытанне аб росце заработнай платы. Мы жалезна дамовіліся: ёсць прадукцыйнасць працы, ёсць рост продажаў — калі ласка, павышайце заработную плату. Няма гэтай прадукцыйнасці працы — няма зарплаты», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «Інакш мы паўторым яшчэ раз гэты фінансава-эканамічны крызіс, які прайшоўся па нас зусім нядаўна», — дадаў Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, ніякіх адступленняў ад гэтага быць не павінна.



Фота БЕЛТА.

«Іншая справа — трэба разбірацца з кіраўнікамі прадпрыемстваў, якія сёння не могуць плаціць заработную плату. Трэба імі займацца, каб мне пасля не давялося», — сказаў Прэзідэнт. «Хачу папярэдзіць, што ніхто работу не знойдзе ў краіне ў цёплым крэсле. Кіраўнік, які вызвалены ад гэтай пасады, не мае права працаваць кіраўніком. Дай бог, каб па спецыяльнасці. Калі не — мятлу ў рукі і месці вуліцы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. «Калі мы гэтага не зробім, мы будзем пастаянна адзін за адным хадзіць і крычаць, што ў нас няма грошай, прадукцыйнасці, зарплат», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка патрабуе да канца пяцігодкі прывесці ў парадак усе сельгасугоддзі і арганізаваць на іх высокаэфектыўную вытворчасць. Асаблівую ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на неабходнасць эфектыўнага выкарыстання меліярацыйных зямель, увядзенне іх у сельгасабарот. «Злачынна не выкарыстоўваць землі так, як трэба, і мы будзем гэту работу павялічваць, скарачаючы ў цэлым датацыі вёсцы», — адзначыў беларускі лідар.

Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, асноўныя сродкі ў бліжэйшыя гады неабходна накіраваць на будаўніцтва і рэканструкцыю ферм і жывёлагадоўчых комплексаў. «Здымайце сродкі з іншых напрамкаў. Але памяшканні для жывёлы трэба пабудаваць. Год-два мы без датацый на тэхніку абыдземся. Сёння тэхнікі хапае, дай бог яе нармальна выкарыстаць», — сказаў Прэзідэнт.

Асобную ўвагу Аляксандр Лукашэнка звярнуў на падрыхтоўку кваліфікаваных кадраў у сферы сельгасвытворчасці. На яго думку, перадавыя прадпрыемствы рэспублікі, такія як саўгас-камбінат «Зара» Мазырскага раёна, павінны стаць цэнтрамі па практычнай падрыхтоўцы кіраўнікоў у аграпрамысловым комплексе. Гэта звязана з тым, што праграмы ВНУ часам значна адстаюць ад практыкі. «Патрэбны моцныя кіраўнікі, а вакол іх будзе цэлая плеяда», — адзначыў Прэзідэнт. СТАР. 2

# БЕЛЫ САД



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Жыхар вёскі Божына Бярэзінскага раёна Міхаіл Баразнёнак не губляе цёплых сонечных дзянькоў і рыхтуецца да новага садова-пчалінага сезона.**

**— Сад павінен быць пабелены да Вялікадня, — кажа пенсіянер, колішні механізатар-хлебароб. — Гэта як візітоўка сапраўднага гаспадара.**

**Больш за чвэрць стагоддзя Міхаіл Цімафеевіч займаецца пчоламі, а садам наогул усё жыццё.**

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла ЖЫЛЕВІЧ, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя:**

***«Мы плануем увесці электронны рэцэпт. Адпаведны пілотны праект стартуе ў Мінску. Поўная інфарматызацыя паліклінік рэспублікі дасць магчымасць у бліжэйшы час увесці электронны рэцэпт і ў рэгіёнах. Карыстальнікі інтэрнэту змогуць працаваць са сваім урачом у анлайн-рэжыме, не прыходзячы ў паліклініку».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.04.2012 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8100,00 | ▲ |
| Еўра | 10630,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 272,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1004,55 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 13° |
| Віцебск | + 15° |
| Гомель | + 15° |
| Гродна | + 14° |
| Магілёў | + 15° |
| Мінск | + 14° |

## АДКРЫЎСЯ СЕЗОН ГАНДЛЮ ЗАГАРАДНАЙ НЕРУХОМАСЦЮ

**Спецыялісты ўпэўнены, што па шэрых схемах без адпаведнага афармлення зямельныя ўчасткі набываць не трэба.**

**Пра апошнія тэндэнцыі на зямельным рынку сталічнага рэгіёна расказвае спецыяліст па аперацыях з нерухомасцю Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Вадзім ІЛЬЧУК.**

***— Лічыцца, што сезон куплі-продажу загараднай жыллёвай нерухомасці і зямельных участкаў адкрываецца пасля таго, як сыдзе снег і добра пацяплее...***

— Так. Аднак нагадаю, што кансультацыі і падбор варыянтаў зямельных участкаў людзі атрымлівалі ў агенцтвах яшчэ ў апошнія дні лютага. А вось зараз пачаліся рэальныя продажы аб'ектаў.

***— Як, у параўнанні з пачаткам года, змянілася актыўнасць кліентаў на зямельным рынку?***

— Актыўнасць ёсць, аднак пакуль яшчэ мала састыковак па кошце аб'ектаў паміж патэнцыяльнымі пакупнікамі і прадаўцамі гэтай маёмасці. Справа ў тым, што сітуацыя сёння, у параўнанні з апошнімі месяцамі летась, істотна змянілася: з рынку зніклі тыя зямельныя ўчасткі, якія былі атрыманы чаргавікамі па сацыяльным кошце. Такія ўладальнікі зямельных участкаў цяпер павінны абавязкова пабудаваць там жыллё, увесці дом у эксплуатацыю, пасля чаго забаронена прадаваць гэтую нерухомую маёмасць на працягу 8 гадоў. Праўда, на рынку засталіся тыя зямельныя ўчасткі, дзе летась была праведзена кансервацыя жыллёвых пабудоў. Аднак уладальнікі закансерваваных аб'ектаў не вельмі спяшаюцца прадаваць сваю нерухомасць. Чаму? Бо пакупнікі разлічваюць купіць як мага танней, а прадаўцы спадзяюцца прадаць даражэй. І тут уладальнікі ліквідных зямельных участкаў часткова маюць рацыю, бо рынак сёлета звузіўся. Цяпер на ім ужо не так шмат участкаў, як гэта было летась.

Разам з тым, сярод жыхароў сталіцы цяпер назіраецца тэндэнцыя, калі сем'і ўжо жадаюць не толькі мець стандартную кватэру ў горадзе і дачу ў адлегласці 30—70 кіламетраў ад Мінска, а менавіта жыць у прыватным доме ў бліжэйшым прыгарадзе. Гэта стала прэстыжным і нават зручным. Наяўнасць уласнай машыны дазваляе працаваць у сталіцы, а жыць побач з прыродай, дзе ўжо зусім іншая экалогія.

***— Гэта ўсё так, але аб уласным доме ў прыгарадзе рэальна могуць марыць толькі дастаткова багатыя мінчане?***

— Аб уласным доме задумваюцца практычна ўсе сем'і з дзецьмі. Сёння людзі ўжо разумеюць, што на зямельным участку не трэба абавязкова будаваць шыкоўны катэдж на 300—500 кв. метраў. Потым яго трэба будзе абслугоўваць. Для камфортнага пражывання стандартнай сям'і дастаткова пабудаваць звычайны дом плошчай да 100—150 кв. метраў. Цяпер нават сярэдні клас сталічных жыхароў пачынае будаваць сабе жыллё за горадам.

Апошнім часам да рынку загараднай нерухомасці пачынаюць прыглядацца так званыя віртуальныя патэнцыяльныя пакупнікі. Гэта тыя людзі, у якіх няма вялікіх грошай, але ёсць некалькі кватэр у Мінску. Пасля продажу адной кватэры яны могуць набыць сабе добры зямельны ўчастак, а пасля продажу другой кватэры — пабудаваць там уласны дом. Пакуль такія сталічныя «віртуалы» яшчэ вагаюцца, але першыя «ластаўкі» сярод іх ужо ёсць.

***— Пасля Новага года кошт зямельных участкаў вакол Мінска павялічыўся. Аб якім цэнніку зараз можа ісці гаворка?***

— Самі зямельныя ўчасткі не падаражэлі. Проста на рынку ўжо няма зусім танных аб'ектаў, якія актыўна прадаваліся да 1 студзеня 2012 года. Цэны на зямельныя ўчасткі цяпер застаюцца на стабільным узроўні.

***— Дзе зараз каля Мінска засталіся цікавыя ўчасткі для кліентаў?***

— Попытам карыстаюцца зямельныя ўчасткі па ўсіх кірунках. На першым месцы застаецца Лагойскі кірунак. Дакладней, гэта масівы каля вёсак Валяр'янава, Мар'яліва (пасёлак газавікоў), Бараўляны, вёскі Раўбічы і Губічы (прыбярэжныя зоны). Пачалі карыстацца попытам зямельныя ўчасткі нават побач з Лагойскам, дзе зямля ўжо падаражэла.

Супердарагая зямля прапануецца індывідуальным забудоўшчыкам у катэджным пасёлку каля вёскі Валяр'янава. Там кошт соткі зямлі складае да 10 тысяч долараў, таму ўвесь участак плошчай каля 15 сотак можа прапаноўвацца пакупнікам за 100—150 тысяч долараў. Гэтыя ўчасткі знаходзяцца ў зоне жылой катэджнай забудовы, дзе ёсць неабходная інфраструктура, у тым ліку з асфальтаванымі пад'ездамі да дамоў і сучаснымі камунікацыямі. У Бараўлянах цэннік зямельных участкаў вагаецца ад 3 да 5 тысяч долараў за сотку.

Дарагая зямля прапануецца і ў прыбярэжных зонах ці побач з прыгожымі ляснымі масівамі, дзе сотка каштуе ад 6 да 8 тысяч долараў. СТАР. 2

**Открытое акционерное общество «Белагропромбанк» сообщает, *что в соответствии с решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк», на основании предложения Правления ОАО «Белагропромбанк»* 20 апреля 2012 года ПРОВОДИТСЯ ВНЕОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ В ЗАОЧНОЙ ФОРМЕ.**

Место нахождения общества, место и время проведения собрания: 220036, г. Минск, проспект Жукова, 3, 15.00.

Повестка дня

1. Об утверждении Положения о порядке предоставления взаем денежных средств дочерним хозяйственным обществам ОАО «Белагропромбанк».

2. О безвозмездной передаче в собственность Республики Беларусь имущества ОАО «Белагропромбанк».

Список лиц, имеющих право на участие во внеочередном Общем собрании акционеров, составляется на основании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 10 апреля 2012 года.

С материалами по вопросам повестки дня лица, имеющие право на участие в Общем собрании акционеров, могут знакомиться по месту нахождения Правления ОАО «Белагропромбанк» (г. Минск, проспект Жукова, 3) с 11 по 18 апреля т.г. ежедневно, кроме выходных и праздничных дней, с 8.30 до 12.30.

Для получения бюллетеней для заочного голосования просим обращаться в ОАО «Белагропромбанк», его филиалы, отделения по месту нахождения акционеров, а также иметь при себе документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – дополнительно документ, подтверждающий полномочия).

Заполненные бюллетени для заочного голосования представляются не позднее 18 апреля 2012 года по адресу: 220036, г. Минск, пр-т Жукова, 3, депозитарий ценных бумаг ОАО «Белагропромбанк» почтовой связью, нарочным по месту нахождения Правления банка, филиалов (отделений) по месту нахождения лиц, имеющих право на участие в Общем собрании акционеров, средствами факсимильной связи по телефону/факсу: 229 64 54 или 229 64 51 с обязательной последующей доставкой (досылкой) оригинала бюллетеня.

Принявшими участие в Общем собрании акционеров считаются лица, заполненные бюллетени которых получены ОАО «Белагропромбанк» в установленном порядке.

**Телефон для справок: 8(017) 229 64 54.**

**Телефон Контакт-центра Банка – 136**
8.00-20.00 – рабочие дни, 8.00-18.00 – выходные и праздничные дни.
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) – по тарифам операторов связи. Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности от 22.07.2009 № 2 выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

## КАЛІ ЎМОВЫ ГОДНЫЯ, ЧАМУ Б НЕ ЗАСТАЦЦА?

**На спартыўнай пляцоўцы ў аграгарадку Міхалкаўская Рудня Мазырскага раёна заўсёды шмат дзяцей. Уваход адкрыты не толькі для вучняў школы, якія займаюцца на футбольным полі з самым сучасным штучным пакрыццём.**

Арцём Гукаў вучыцца ў 9 класе Руднянскай школы. Гаворыць, што збіраецца працягваць навучанне ў Мазырскім політэхнічным тэхнікуме па спецыяльнасці «Машынабудаванне». А потым, напэўна, вернецца ў родную вёску:

— Буду тут жыць. Столькі людзей сюды прыязджае апошнім часам! Ды і бацькі добры заробак атрымліваюць. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ



### ЗША ЗАПЛАЦЯЦЬ ІНДЗЕЙЦАМ

Урад ЗША выплаціць 41 індзейскаму племені больш за мільярд долараў за дрэннае кіраванне іх землямі і прыбыткамі з гэтых земляў, паведамляе Associated Press. Гаворка ідзе пра кіраванне адлічэннямі за распрацоўку нафтавых і газавых радовішчаў, змешчаных на землях індзейцаў, продажы драўніны і выкарыстанні паш. У чэрвені 2011 года ўрад ЗША па іншай дамове абавязаўся выплаціць індзейцам 3,4 мільярда долараў. Судовыя цяжбы з плямёнамі (а іх больш за 70) усё яшчэ працягваюцца.

### ДЭМАНТАЖ АЭС АБЫДЗЕЦЦА Ў МІЛЬЯРДЫ

Нямецкім падаткаплацельшчыкам давядзецца заплаціць мільярды еўра за дэмантаж АЭС пасля іх канчатковага закрыцця ў 2022 годзе, піша Spiegel. Эколагі падлічылі, што на ліквідацыю станцый спатрэбіцца ад 44 да 60 мільярдаў еўра. Энергаканцэрны, якія кіруюць нямецкімі АЭС, стварылі назапашвальныя фонды, якія пасля будуць выдаткаваны на дэмантаж атамных станцый. Паводле звестак Нямецкага атамнага форуму, зараз аб'ём фондаў складае каля 30 мільярдаў еўра. Эколагі асцерагаюцца, што энергаканцэрны не збяруць дастаткова сродкаў, а пасля адмовы ад атамнай энергетыкі і зусім адмовяцца ад сваіх абавязкаў па дэмантажы станцый.

### ІСЛАМІСТЫ ПРЫСТРАШЫЛІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ «ЕЎРАБАЧАННЯ»

У Азербайджане рэлігійныя экстрэмісты выступілі на адным са сваіх сайтаў з пагрозамі ў адрас удзельнікаў міжнароднага конкурсу песні «Еўрабачанне», які пройдзе ў Баку з 22 па 26 мая. На рэсурсе было размешчана паведамленне, аўтар якога называе «Еўрабачанне» «страшным сном для ўсіх мусульман». Ён падкрэслівае, што на ўдзельнікаў конкурсу, якія ў тэксце значацца як «сілы шайтана», «вычварэнцы» і «гомасэксуалісты свету», будуць арганізаваны нападзенні. З паведамлення можна таксама зрабіць выснову, што азербайджанскія маджахеды ўзялі на сябе адказнасць за спробы здзяйснення тэрактаў у шэрагу гарадоў рэспублікі.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### ПУЦІН І МЯДЗВЕДЗЕЎ ПАВЕДАМІЛІ ПРА СВАЕ ДАХОДЫ



**На сайтах прэзідэнта Расіі і ўрада апублікаваны звесткі пра даходы і маёмасць першых асоб дзяржавы, іх сем'яў, а таксама работнікаў адміністрацыі і апарату. У 2011 годзе Дзмітрый Мядзведзеў зарабіў менш за Уладзіміра Пуціна.**

Даход прэзідэнта Расіі Дзмітрыя Мядзведзева па асноўным месцы працы за 2011 год склаў 3 371 353,27 рубля — прыкладна столькі, колькі летась. Ён мае ў банках 15 рахункаў на агульную суму ў 5 178 081,62 рубля. Валодае на ўмовах арэнды зямельным участкам плошчай 4700 квадратных метраў. Ва ўласнасці расійскага лідара два легкавыя аўтамабілі — ГАЗ-20 «Перамога» 1948 года выпуску і ГАЗ-21 1962 года выпуску. Сумесна з жонкай прэзідэнт валодае кватэрай плошчай 367,8 м$^2$.

Даход прэм'ер-міністра Уладзіміра Пуціна па асноўным месцы працы за 2011 год склаў 3 661 765 рублёў — амаль на два мільёна менш, чым летась. Ва ўласнасці кіраўніка ўрада знаходзіцца зямельны ўчастак пад індывідуальнае жыллёвае будаўніцтва плошчай 1500 м$^2$, кватэра — 77 м$^2$, гараж плошчай 12 м$^2$. Плюс кватэра плошчай 153,70 м$^2$ і гараж (18 м$^2$) — у бестэрміновым карыстанні. У Пуціна таксама ёсць тры легкавыя аўтамабілі — ГАЗ М-21, ГАЗ М-21Р і ВАЗ «Ніва», а таксама аўтапрычэп «Скіф», успадкаваны ад бацькі.

КОРАТКА

Каля 4 гадзін раніцы работнікі Ганцавіцкай міжрайінспекцыі знаходзіліся ў прыродаахоўным рэйдзе, калі паспрабавалі спыніць для праверкі легкавы аўтамабіль... Паводле інфармацыі дзяржінспектараў, у машыне перавозілі незаконна здабытую рыбу. Аднак кіроўца аўтамабіля і не падумаў спыняцца. Пры гэтым аднаму з работнікаў міжрайінспекцыі былі нанесены цялесныя пашкоджанні. Зараз праверкай абставін здарэння займаюцца праваахоўныя органы.




## ЯКАЯ ПРАФЕСІЯ ПАВІННА БЫЦЬ САМАЙ ВЫСОКААПЛАТНАЙ?

**«Белстат» паведаміў аб тым, у каго з беларусаў самы лепшы заробак: па звестках за люты, у пяцёрку спецыяльнасцяў з найбольш высокай зарплатай увайшлі праграмісты, нафтавікі, шахцёры, а таксама работнікі хімічнай вытворчасці і фінансавай сферы.**



**Алег ЦЮРЫН, начальнік аддзялення агітацыі і прапаганды УДАІ УУС Мінаблвыканкама:**

— Кожны, зразумела, пры адказе на гэтае пытанне захацеў бы назваць сваю прафесію. Але тое, што хвалюе ўсіх людзей на свеце, што магло б аб'яднаць меркаванні, — гэта здароўе. У сферы яго аховы асабліва важна бачыць працу сапраўдных прафесіяналаў і адданых сваёй справе людзей. А выключны прафесіяналізм, вядома, у матэрыяльным плане павінен адпаведна ўзнагароджвацца.



**Міхаіл КРЫВЕЦКІ, плавільшчык сплаваў і металаў на ААТ «МАЗ»:**

— Не буду разважаць пра тых, хто працуе ў іншых сферах, бо тут у кожнага свае «падводныя камяні». А вось пра сваю скажу, што нам маглі б плаціць і крыху больш, чым цяпер. Мы фізічна выкладваемся не менш, чым шахцёры. Ды і розум напружваць даводзіцца дастаткова. Каму здаецца, што кажу няпраўду, той няхай паспрабуе па колеры расплаўленага металу вызначыць яго тэмпературу.



**Юлія ДЗЕНІСЮК, інспектар па кантролі за выкананнем даручэнняў УП «Гефест-тэхніка»:**

— А я думаю, што прадстаўнікі прафесій, якія ўвайшлі ў пяцёрку найбольш высокааплатных, цалкам гэтага заслугоўваюць. Праца тых жа шахцёраў ці хімікаў дастаткова шкодная для здароўя. Да таго ж свой заробак гэтыя людзі апраўдваюць фінансавым прыбыткам, які яны прыносяць краіне.

**Падрыхтавала Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

# БЕЗ РОСТУ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ НЕ БУДЗЕ ПАВЫШЭННЯ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Ён таксама сказаў, што Беларусь выканае абавязацельствы ў рамках АЭП па скарачэнні аб'ёмаў дзяржпадтрымкі сельгасвытворцаў. «Злачынна не выкарыстоўваць землі так, як трэба. І мы будзем гэту работу павялічваць, скарачаючы ў цэлым датацыі вёсцы. Таму што вы ведаеце (дзякуй Богу, што пакуль не ў СГА) — мы ў АЭП маем абавязацельствы: Казахстан, Расія і мы павінны апусціцца да аднаго ўзроўню дзяржпадтрымкі сельгасвытворцаў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Так, мы будзем апускацца. Але трэба тут пераразмяркоўвацца. Трэба больш накіраваць грошай на тое, каб увесці ў абарот землі. Трэба больш кінуць грошай на вытворчасць — будаўніцтва ферм, комплексаў, іх рэканструкцыю». «Цяпер схопім гэту работу, рынкі, якія сёння свабодныя, тады мы будзем штосьці мець», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

У той жа час Аляксандр Лукашэнка лічыць, што развіццё аграгарадкоў павінна прадаўжацца, аднак ужо не за кошт рэспубліканскіх сродкаў. «Ні ў якім выпадку нельга застыць на гэтым узроўні. Часта бывае так, што ўзяліся за іншую праблему і забылі», — сказаў Прэзідэнт.

У якасці аднаго з узорных Аляксандр Лукашэнка прывёў як прыклад аграгарадок Рудня Мазырскага раёна, які ён сёння наведаў. З пераўтварэннем вёскі Рудня ў аграгарадок у 2008 годзе тут адбыліся значныя паляпшэнні ў сацыяльна-бытавым развіцці. Выкананы вялікі аб'ём работ па добраўпарадкаванні тэрыторыі, рэканструяваны стадыён, пабудаваны тэнісны корт, праведзены капітальныя рамонты дзіцячага сада, школы, амбулаторыі, сельскага Дома культуры, аптэкі, аддзялення паштовай сувязі, вядзецца работа па добраўпарадкаванні возера. У 2007—2011 гадах у Рудні пабудавана і заселена 27 жылых дамоў сядзібнага тыпу.

«Трэба давесці ўсе аграгарадкі да ўзроўню Рудні. Тут ёсць усё неабходнае для жыцця. Са школы тут усе ідуць у тэхнічныя ВНУ і сельскую гаспадарку. Можна толькі марыць аб гэтым», — сказаў кіраўнік дзяржавы. «За гэту пяцігодку трэба ўтрэсці гэтыя пытанні, каб у далейшым мы не гаварылі ўжо аб будаўніцтве, пераўтварэнні, рэканструкцыі аграгарадкоў. У гэтай пяцігодцы мы павінны завяршыць гэты працэс», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка даручыў наладзіць у Беларусі вытворчасць і перапрацоўку мармуровага мяса: «Мармуроваму мясу быць, — сказаў ён. — Мы наладзім асобную перапрацоўку, разам знойдзем рынкі рэалізацыі і будзем прадаваць». Прэзідэнт адзначыў, што беларускія спецыялісты ўжо вывучаюць замежны вопыт у гэтай справе. «Цяпер мы купляем лінію, гэта нядорага для дзяржавы, усё па еўрапейскіх стандартах упакуем і будзем прадаваць. Сёння вялікі попыт на такую прадукцыю ў Расіі. Таму займацца гэтым будзем, у нас прападае вялікая колькасць угоддзяў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў віцэ-прэм'еру Міхаілу Русаму да канца вывучыць гэта пытанне і арганізаваць перапрацоўку мармуровага мяса. «Трэба сваіх людзей прывучаць да нармальнага мяса і лішкі рэалізоўваць у Маскву», — сказаў Прэзідэнт.

**Кар. БЕЛТА.**

# АДКРЫЎСЯ СЕЗОН ГАНДЛЮ ЗАГАРАДНАЙ НЕРУХОМАСЦЮ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

***— Хто цяпер набывае такую дарагую зямлю? Гэта прыватныя структуры, фірмы, ці можа багатыя замежныя бізнэсмены?***

— Зямельныя ўчасткі пад індывідуальнае будаўніцтва купляюць прыватныя асобы. Гэта не заўсёды мінчане, але амаль заўсёды беларусы. Жыллёвую нерухомасць з зямлёй часам набываюць і грамадзяне іншых краін. У гэтым выпадку зямельны ўчастак афармляецца на такога ўласніка ў доўгатэрміновую арэнду. Попыт на зямельныя ўчасткі з боку жыхароў буйных гарадоў Расіі існуе, але на рынку гэта не адыгрывае сур'ёзнай ролі.

***— Дзе існуюць зямельныя ўчасткі па сярэднім кошце?***

— Крыху меншым попытам карыстаюцца зямельныя ўчасткі па маскоўскім кірунку (напрыклад, у Калодзішчах); Мядзельскі кірунак (Сёмкава, Ждановічы, пасёлак Зялёнае). У залежнасці ад наяўнасці камунікацый і інфраструктуры сотка зямлі тут каштуе ад 3 да 5 тысяч долараў. Адразу заўважу, што зусім пустыя зямельныя ўчасткі ніхто зараз і не прадае. Зямля ў чыстым выглядзе не з'яўляецца аб'ектам нерухомасці. Аднак другасны зямельны рынак існуе, і гэта цалкам законны бізнэс. Фармальна на продаж прапануецца не зямля, а зямельныя ўчасткі з нейкімі хаткамі, ці з незавершаным закансерваваным збудаваннем.

***— У сувязі з гэтым існуе адно правакацыйнае пытанне. Бываюць выпадкі, калі ўладальнікі зямельных участкаў, якія былі атрыманы па сацыяльным кошце, прапануюць іншым асобам будаваць на іх зямлі сабе жыллё. Па дакументах гаспадаром пабудаванага дома з'яўляецца потым той грамадзянін, што атрымліваў зямельны ўчастак у якасці чаргавіка. Бакі дамаўляюцца палюбоўна такім чынам, што праз 8 гадоў, калі будзе знята забарона на продаж падобных аб'ектаў, адбудзецца пераафармленне жылога дома з зямлёй на імя рэальнага гаспадара, які менавіта яго і будаваў. Вы з такімі здзелкамі сустракаліся?***



— Пра такія выпадкі я сапраўды чуў, аднак... Спецыялісты агенцтваў нерухомасці такімі здзелкамі ніколі займацца не будуць. Гэта вельмі рызыкоўныя і сумніўныя здзелкі. Ведаеце, што з-за спрэчных момантаў часам моцна сварацца нават блізкія сваякі, а тут, па сутнасці, чужыя людзі. Я бы нікому не раіў займацца такімі шэрымі схемамі.

***— Дзе сёння магчыма набыць самыя танныя зямельныя ўчасткі?***

— Гэта магілёўскі кірунак, дзе прадаць не зусім ліквідны зямельны ўчастак бывае часам даволі складана. У зямельных масівах каля вёсак Сосны, Стайкі і Вялікі Трасцянец сотка зямлі будзе каштаваць да 3 тысяч долараў і нават значна танней.

***— Чаго чакаць на зямельным рынку сталічнага рэгіёна ў бліжэйшай перспектыве?***

— Загарадная нерухомасць вакол Мінска з цягам часу будзе толькі даражэць. Новыя зямельныя масівы пад індывідуальнае будаўніцтва ў прыгараднай зоне сталіцы ўжо больш не фарміруюцца, на пэўную колькасць участкаў існуе забарона па продажы на працягу 8 гадоў. Таму колькасць прапановы ліквідных участкаў памяншаецца. У сувязі з гэтым мне здаецца, што на працягу года зямельныя ўчасткі тут падаражэюць прыкладна на 10—15 працэнтаў.

***— Сёння на другасным рынку прадаюцца і цалкам гатовыя для жыцця катэджы і дамы. Якія тут існуюць цэннікі?***

— Па лагойскім кірунку самыя танныя індывідуальныя дамы сярэдняй якасці каштуюць ад 100 да 130 тысяч долараў. Вялікая колькасць якасных катэджаў у гэтай зоне мае цэннік каля 200—350 тысяч долараў. Ёсць у продажы і ўвогуле шыкоўныя дамы коштам у межах ад 900 тысяч да 1,5 млн долараў. Часам кошт такіх аб'ектаў не заўсёды адпавядае рынкавым законам. Уявіце, што калі чалавек пабудаваў катэдж за 600 тысяч долараў, а потым прапануе яго на продаж за 1,5 млн долараў, то ў гэтым выпадку такі гаспадар выставіў не зусім адэкватны цэннік. Ёсць у продажы і дарагія катэджы па рэальных цэнах, калі адразу відаць, што сабекошт аб'екта блізкі да яго цаны продажу. Цяпер у продажы існуе адзін катэдж за 1,2 млн долараў, дзе сантэхніка зроблена часткова з золата, а ў элементах дэкору масава прысутнічаюць каштоўныя камяні. Аднак на гэты катэдж попыт мінімальны...

***— Ці магчыма набыць у прыгараднай зоне Мінска сапраўды танныя катэджы для небагатых?***

— Гэта тыя першыя катэджы, якія будаваліся яшчэ ў 80—90-гадах мінулага стагоддзя. Па кошце каля 70—80 тысяч долараў прапануюцца катэджы так званага бюджэтнага варыянта. Там яшчэ прысутнічаюць чыгунныя батарэі, а драўляныя вокны не паменены на шклопакеты.

***— Хто цяпер у сталіцы сур'ёзна займаецца жыллёвай нерухомасцю па прыгараднай зоне Мінска?***

— У цэнтры гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» гэтымі днямі ствараецца спецыяльны аддзел, які будзе займацца непасрэдна загараднай нерухомасцю. Кліентам будуць прапаноўвацца зямельныя ўчасткі, катэджы, жылыя дамы, дачы і садовыя домікі. Менавіта зараз збіраецца каманда прафесіяналаў, якія раней працавалі ў розных агенцтвах нерухомасці.

***— Дзе будзе дзейнічаць ваша база спецыялістаў?***

— Наш аддзел будзе размешчаны на тэрыторыі бізнэс-цэнтра «Аквабел», што знаходзіцца непасрэдна пры выездзе з Мінска па Лагойскай трасе.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Рэспубліканскія дарогі

# З ДАРОЖНЫМІ ЗБОРАМІ НАРМАЛЬНА... ПРАБЛЕМА З РАМОНТАМ

**Да 15 красавіка сетка рэспубліканскіх аўтадарог павінна быць гатовай да летняй эксплуатацыі. Паколькі сёлетняя вясна прыйшла з пэўным спазненнем, то і адпаведныя дарожныя работы разгарнуліся ў поўным аб'ёме з адтэрміноўкай. На шчасце, сёлетняя зіма выдалася з малой колькасцю пераходаў праз нуль градусаў, а таму дарожнае пакрыццё захавалася ў лепшай форме, чым, напрыклад, год таму.**

З надыходам вясны актывізаваліся і работы па рэканструкцыі аўтадарог, якія звязваюць сталіцу з абласнымі цэнтрамі. Так, на першым этапе працягваецца рэканструкцыя дарог М-4 Мінск—Магілёў і М-5 Мінск—Гомель. На рэканструкцыю М-4 Мінск—Магілёў быў выдаткаваны крэдыт ААТ «ААБ Беларусбанк». Паводле слоў **намесніка начальніка ўпраўлення ўтрымання дарожнай сеткі дэпартамента «Белаўтадар» Яўгена РАКАЛЫ,** мяркуецца, што ўжо 1 верасня гэтага года ў краіне з'явіцца першая дарога ад Мінска да абласнога цэнтра 1-й катэгорыі. Рэканструкцыя дарогі М-5 Мінск—Гомель ажыццяўляецца за кошт замежных інвестыцый. Пасля рэалізацыі вышэйназваных двух праектаў плануецца прыступіць да рэканструкцыі аўтадарог М-6 Мінск—Гродна і М-3 Мінск—Віцебск. Так да канца 2017 года працягласць рэспубліканскіх дарог 1-й катэгорыі складзе 1 тыс км.

Да 2014 года будзе працягвацца будаўніцтва другой кальцавой аўтамабільнай дарогі вакол Мінска на ўчастку ад аўтадарогі М-3 Мінск—Віцебск да М-6/Е28 Мінск—Гродна—мяжа Рэспублікі Польшча працягласцю 44 км. А ў 2014—2017 гадах будзе пабудаваны яшчэ 41 км — на ўчастку ад М-6/Е28 Мінск—Гродна—мяжа Рэспублікі Польшча да М-1/Е30 Брэст (Казловічы)—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі (Рэдзькі). Новая кальцавая будзе мець агульную працягласць 157 км, чатырохпалосную праезную частку шырынёй у кожным напрамку па 7 м. Будаўніцтва дарогі ажыццяўляецца за сродкі дзяржаўнага мэтавага фонду нацыянальнага развіцця. Праўда, фінансавы крызіс, які абумовіў падаражанне будматэрыялаў да 3-5 разоў, вымусіў прыпыніць распачатыя летась работы. Зараз разглядаецца пытанне пошуку дадатковых крыніц фінансавання і аднаўлення работ.

— Значная частка рэспубліканскіх дарог мае пратэрміноўку па міжрамонтных работах, — кажа Яўген Ракала. — Аднаўленне штогадовага зносу не забяспечваецца. У выніку, паводле апошніх звестак дыягностыкі, 6,6 тыс. км, або 43 працэнты ад агульнай працягласці рэспубліканскіх дарог, патрабуюць неадкладнага рамонту. На гэтыя мэты неабходна затраціць каля 4 трлн рублёў, а выдаткавана з бюджэту толькі 1,6 трлн. Такім чынам, капрамонт сёлета перажывуць толькі 20 км дарог, а бягучы, куды ўваходзіць разметка праезнай часткі і павярхоўная апрацоўка або замена верхняга слою пакрыцця, ахопіць 934 км, што нават крыху менш, чым летась...

Што да аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу, то па іх колькасці мы ўжо апярэджваем блізкіх замежнікаў і набліжаемся да еўрапейскіх стандартаў. У Беларусі, як вядома, існуе тры ўзроўні прыдарожнага сэрвісу. Самы просты, першы — звычайная пляцоўка для адпачынку плюс, магчыма, туалет, трэці ўзровень — гэта комплексны аб'ект, які ўключае заправачную станцыю, пункт харчавання, пляцоўку адпачынку для аўтамабіляў, гасцініцу, кавярню. Такія аб'екты ўзводзяць, як правіла, буйныя інвестары.

Як паведамляе спадар Ракала, з 1 ліпеня наступнага года на магістралі М-1/Е30 Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі пачне дзейнічаць бескантактная сістэма аплаты дарожных збораў. Спецыяльныя рамкі будуць фіксаваць перасоўванне аўтамабіля дзякуючы бартавому абсталяванню, якое вадзіцель зможа ўзяць па залогавым кошце на прыгранічных пунктах або на АЗС. Абсталяванне дазволіць аплачваць якраз столькі кіламетраў, колькі давялося праехаць. Аналагічную сістэму плануецца ўкараніць на аўтадарозе М-4 Мінск—Магілёў пасля яе рэканструкцыі. Надалей платнымі для некаторых катэгорый транспартных сродкаў могуць стаць усе рэканструяваныя ўчасткі дарог ад сталіцы да абласных цэнтраў. Памеры дарожных збораў зараз пралічваюцца, аднак, хутчэй за ўсё, яны не перавысяць 30-40-працэнтны бар'ер ад тарыфаў, устаноўленых, скажам, у Польшчы ці Германіі. З фізічных асоб нашай краіны, Расіі і Казахстана дарожныя зборы спаганяцца, зразумела, не будуць.

Сёння платнай у Беларусі застаецца толькі аўтадарога М-1/Е30 Брэст—Мінск—мяжа Расійскай Федэрацыі. Нягледзячы на паступовы рост тарыфаў, транспартны паток павялічваецца. А значыць, і аб'ёмы збораў стабільна растуць.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■ Парламенцкі дзённік

# ЖЫЦЦЁ ДЫКТУЕ НОВЫЯ ЗАКОНЫ

**16 пытанняў: 9 ратыфікацый і 7 законапраектаў, якія датычацца змен у дзеючым заканадаўстве, — такі быў парадак дня чарговага пасяджэння 10 сесіі ніжняй палаты Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь. Для сённяшняга рэпартажу «Звязда» абрала з гэтага пераліку толькі тры.**

## Сацыяльнае абслугоўванне: усім светам

Учарашняе пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў адкрылася першым чытаннем законапраекта, які прадугледжвае значныя змены ў сістэмы сацыяльнай абароны насельніцтва. Гэта той выпадак, калі закон ствараецца пад ужо апрабаваны вопыт, які добра сябе зарэкамендаваў. Нашай краіне даўно ўжо вядомыя валанцёрскі рух, сацыяльны патранат, паслугі сацыяльнай перадышкі, суправаджальнага пражывання і падобнае. Аднак упершыню ўсё гэта будзе прапісана ў законе. Як, дарэчы, самі формы і змест сацыяльных паслуг, дакладнае вызначэнне катэгорый грамадзян, якім яны павінны аказвацца, а таксама — хто іх можа аказваць, а хто — кантраляваць якасць.

— Законапраект будзе накіраваны на тыя катэгорыі насельніцтва, якія патрапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю, — патлумачыла журналістам **член Пастаяннай камісіі па працы, сацыяльнай абароне, справах ветэранаў і інвалідаў Алена ДЗІКАВІЦКАЯ.** — Самай галоўнай яго навіной з'яўляецца раздзел, прысвечаны ўтварэнню сістэмы дзяржаўнага сацыяльнага заказу. Гэта дазволіць сфарміраваць рынак сацыяльных паслуг на падставе дзяржаўнага і прыватнага партнёрства. У нас ёсць катэгоры людзей, якіх дзяржава не можа абслужыць з-за недахопу спецыялістаў, аддаленасці рэгіёнаў. Ёсць пералік захворванняў, якія з'яўляюцца супрацьпаказаннямі для аказання стацыянарнай сацыяльнай дапамогі: хранічны алкагалізм, актыўная форма сухотаў, асобныя псіхічныя захворванні, наркаманія... Таму вельмі карысна будзе і для дзяржавы, і для насельніцтва, калі сумесна, усім светам — індывідуальныя прадпрымальнікі, юрыдычныя і фізічныя асобы, замежныя інвестары і дзяржава — аб'яднаюцца ў аказанні сацыяльнай дапамогі ўсім, хто мае ў гэтым патрэбу.

Размова ідзе пра конкурс сацыяльных праектаў, удзельнічаць у якім змогуць як дзяржаўныя арганізацыі, так і фізічныя асобы або індывідуальныя прадпрымальнікі. Грошы на мясцовым узроўні будуць выдзяляцца дзяржавай, мясцовыя органы ўлады будуць выступаць заказчыкамі такіх паслуг і кантралёрамі іх якасці. Законапраект прадугледжвае таксама замежнае інвеставанне сацыяльных праграм.

— Сёння ў нас 508 тысяч інвалідаў, 130 тысяч адзінокіх пажылых грамадзян, 583 тысячы адзінока пражываючых, — прадставіла праект закона **дэпутатам міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА.** — Пытанні іх сацыяльнага абслугоўвання могуць вырашацца за кошт прыцягнення грамадзянскай супольнасці, перш за ўсё недзяржаўнага сектара, які жадае і можа аказваць такія паслугі. Чакаецца, што дзеянне механізму дзяржаўнага сацыяльнага заказу дазволіць аператыўна вырашыць найбольш значныя сацыяльныя праблемы і ўкараняць інавацыйныя тэхналогіі сацыяльнага абслугоўвання. Магчымасць саўдзелу дзяржавы ў фінансаванні сацыяльных праектаў створыць добрыя ўмовы і для прыцягнення ў Беларусь інвестараў. Прапановы такія паступалі, але адсутнасць заканадаўча замацаванага механізму не дазволіла рэалізаваць іх у поўнай меры.

## «Зялёнае святло» для інвестараў

Стварыць адпаведныя міжнародным стандартам умовы для страхавання замежных інвестараў на тэрыторыі Беларусі павінны два пагадненні, якія таксама былі ўчора ратыфікаваны ў Авальнай зале.

Першае — паміж урадам Рэспублікі Беларусь і Шматбаковым агенцтвам па інвестыцыйных гарантыях прававой абароны замежных інвестыцый (МАГІ), другое — паміж урадам і МАГІ аб выкарыстанні мясцовай валюты.

— Гэтыя пагадненні будуць садзейнічаць прыцягненню замежных фінансавых рэсурсаў без прадастаўлення інвестарам гарантый урада Беларусі, — патлумачыў **дэпутатам міністр эканомікі Рэспублікі Беларусь Мікалай СНАПКОЎ.** — А гэта, у сваю чаргу, дазволіць не павялічваць памер знешняга дзярждоўгу Беларусі. Пакуль ніякіх здзелак з інвестарамі пры ўдзеле агенцтва Беларусь не ажыццявіла, але ўжо зараз можна сказаць, што інтарэс да нашай краіны ёсць, бо МАГІ пацвярджае добрыя ўмовы ў Беларусі для прыцягнення інвестыцый. Яны чакаюць зялёнае святло нашай згоды, і пасля ратыфікацыі закона мы зможам даць справаздачу пра поспехі і перавагі, якія атрымае наша краіна.

Адказваючы пазней на пытанні журналістаў пра ход прыватызацыі, Мікалай Снапкоў расказаў пра тое, што зараз вядуцца канкрэтныя перамовы аб васьмі прадпрыемствах розных галін: харчовая перапрацоўка, дрэваперапрацоўка, будаўнічая арганізацыя і іншыя. «Сёння ўжо адбыўся конкурс фінансавых кансультацый. Трэба сказаць, што апетыт быў сур'ёзны — 30 удзельнікаў, — падзяліўся інфармацыяй міністр. — Пакуль сярод іх выбралі 13, будзе прызначаны конкурс, і прыватызацыя вышэйназваных прадпрыемстваў ажыццявіцца цалкам у адпаведнасці з тымі міжнароднымі стандартамі, якія зараз існуюць у лепшых сусветных практыках».

Мікалай Снапкоў падкрэсліў, што размова ідзе пра сярэднія прадпрыемствы, якія, у адрозненне ад «блакітных фішак», з'яўляюцца індыкатарам пастаяннай, нармальнай, канструктыўнай прыватызацыйнай работы, што адбываецца згодна з заяўленым планам.

Па просьбе журналістаў міністр адказаў на пытанне пра памер сярэдняга заробку ў Беларусі, які вызначаны ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця на 2011 — 2015 гады. «Як індыкатар нацыянальнай бяспекі закладзены памер заробку, які роўны 80 % ад сярэдняга заробку краін-суседзяў, — патлумачыў ён. — Гэтага мы павінны дасягнуць для таго, каб кадры не пакідалі краіну па прыкмеце заработнай платы».

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА**

## ПОМНІЦЬ АБ МІНУЛЫМ, КАБ ЗБЕРАГЧЫ БУДУЧЫНЮ

**Моладзевая грамадска-культурная акцыя «Зберагчы Беларусь для будучыні» прайшла ў гарадскім Доме культуры Слуцка. Мерапрыемства прысвечана адразу дзвюм трагічным падзеям у жыцці нашай краіны — у сталічным метро і на Чарнобыльскай АЭС.**

Ушанаваць памяць ахвяр сабралася больш за 500 юнакоў і дзяўчат з усіх куткоў Міншчыны. Варта зазначыць, што трагічная падзея глыбока закранула моладзь, аб чым сведчыць тое, што ў пункты пералівання крыві прыходзілі нават непаўналетнія. Але юных выратавальнікаў медыкі пераконвалі ў тым, што здаваць кроў могуць толькі дарослыя.

— Гэта магчымасць яшчэ раз успомніць усіх пацярпелых у выніку трагедый, паколькі сярод іх нямала і жыхароў Мінскай вобласці, — сказаў начальнік аддзела па справах моладзі Мінаблвыканкама Алег Маслаў.

Шчырыя словы спагады выказалі і ўдзельнікі канцэрта-прысвячэння: творчыя моладзевыя калектывы, выканаўцы Лідзія Заблоцкая, Ніка Барынава, Уладзіслаў Плігаўка. Малады паэт Рагнед Малахоўскі і галоўны рэдактар штотыднёвіка «ЛіМ» Таццяна Сівец прачыталі свае вершы, якія адпавядалі агульнаму настрою. У той красавіцкі дзень у Таццяны загінула калега, з якой яна размаўляла літаральна за некалькі гадзін да трагедыі. Пасля выбуху было страшна спускацца ў метро, у вачах людзей чыталася разгубленасць. Ніхто не думаў, што такое можа здарыцца з табой, тваімі знаёмымі. Але таксама было і імкненне пераадолець страх... Насамрэч, беларусы вельмі моцныя людзі, — адзначыла паэтка. На мерапрыемстве не было пафасных прамоў, надуманых пачуццяў. Людзі сабраліся, каб успомніць тых, каго няма, і нагадаць яшчэ раз тым, хто застаўся, што ўсім нам ёсць дзеля чаго жыць, што варта цаніць жыццё. Па прыездзе ў Мінск удзельнікі акцыі ўсклалі кветкі да мемарыяльнага знака, усталяванага каля ўвахода на станцыю метро «Кастрычніцкая».

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ**

## АБЗАЦ

◢ У Мінску плануецца павысіць тарыфы на сацыяльныя паслугі сядзелак тэрытарыяльных цэнтраў абслугоўвання насельніцтва, паведамілі БЕЛТА ў камітэце па працы, занятасці і сацабароне Мінгарвыканкама. Цяпер кошт норма-гадзіны паслуг сядзелкі ўдзень складае Br5240. Плануецца павысіць тарыфы да ўзроўню іх самаакупнасці: за 1 гадзіну ўдзень — да Br19,3 тыс., уначы — да Br22,4 тыс. Па меркаванні спецыялістаў, такая мера дапаможа павялічыць штат сядзелак, паслугі якіх запатрабаваныя насельніцтвам.

**◢ На чыгуначным вакзале ў Баранавічах быў затрыманы непрацуючы мясцовы жыхар 1985 г.н., які спрабаваў схаваць у роце асабліва небяспечныя псіхатропныя рэчывы. Пры асабістым даглядзе ў роце мужчыны быў знойдзены палімерны пакет з 3,7 г рэчыва, якое экспертыза прызнала псіхатропам.**

◢ Шэраг крымінальных спраў заведзены ў дачыненні кіраўнікоў Аршанскага мясакансервавага завода. Супрацьпраўная дзейнасць службовых асоб на чале з дырэктарам спынена ўпраўленнем КДБ па Віцебскай вобласці сумесна з іншымі праваахоўнікамі. Устаноўлена, што праз падстаўныя фірмы ў РФ было выведзена з актываў камбіната каля $2 млн. Выяўлены і іншыя парушэнні.

## ПОЎНЫ АБЗАЦ



**◢ 76-гадовы пенсіянер з Заальфельда (Германія) незвычайным чынам упрыгожыў яблыню, што расце каля яго дома. Пенсіянер вырашыў размясціць на дрэве сваю вялікодную калекцыю яек. Цяпер яго калекцыя, якую ён збірае з 1965 года, складае 10 тыс. яек. Збіраць яе дапамагала ўся сям'я. Прынята рашэнне спыніць пашырэнне калекцыі, бо экспанаты няма дзе захоўваць. Між тым, дрэў у садзе немца засталося шмат...**

*Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.*

## ЗНАЙШЛІ І АБЯСШКОДЗІЛІ

Паблізу вёскі Жыхары Полацкага раёна супрацоўнікі міліцыі знайшлі ў лесе 16 артылерыйскіх снарадаў, восем узрывальнікаў і 51 патрон калібру 7,62 міліметра. Небяспечныя знаходкі абясшкоджаны сапёрамі.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

**25 апреля 2012 г. в 10.30 состоится внеочередное общее собрание акционеров ОАО «Брестский КСМ».**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об утверждении локальных нормативных актов.
2. О совершении сделок общества.
3. О приобретении акций ОАО «Брестский КСМ» на баланс общества.
4. Об оказании безвозмездной (спонсорской) помощи.

Местонахождение ОАО «Брестский КСМ»: г. Брест, ул. Московская, 360.
Место проведения собрания: г. Брест, ул. Московская, 360.
Время регистрации в день проведения собрания: с 10.00 до 10.30.
При себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера — доверенность).
С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни, начиная с 17.04.2012 г. (с 10.00 до 16.00) по месту нахождения общества.
Совет директоров.

*УНП 200295903.*

# КАЛІ ЎМОВЫ ГОДНЫЯ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аграгарадок Міхалкаўская Рудня па інфраструктуры можа паспяхова канкурыраваць з горадам. Дзіцячы садок, школа, Дом культуры, крамы, зала ўрачыстасцяў... Людзі тут і працуюць, і адпачываюць ва ўмовах, якім і гаражане зайздросцяць. Недарма «Зара» лічыцца адным з лепшых аграрных прадпрыемстваў не толькі ў Гомельскай вобласці, але і ў краіне. Тут перадавыя тэхналогіі і адпаведная зарплата. На мясцовым свінакомплексе жывёл утрымліваюць, выкарыстоўваючы тэхналогію глыбокай падсцілкі. Свінні растуць хутчэй, а выдаткі на іх утрыманне меншыя. Дзяржаўнае аграпрамысловае прадпрыемства дынамічна развіваецца. Планавая мадэрнізацыя свінагадоўчага комплексу і птушкагадоўчай фермы дазваляюць павялічваць аб'ёмы і паляпшаць якасць прадукцыі, якая рэалізуецца праз развітую сетку фірменнага гандлю. Дарэчы, крамы «Дары ад Зары» ведаюць па ўсім гомельскім Палессі. Адначасова ў саўгасе імкнуцца забяспечыць годныя ўмовы не толькі для працы, але і для жыцця. Вось таму аграгарадок Міхалкаўская Рудня можна без перабольшвання называць вёскай XXI стагоддзя.

Пры гэтым усё новае ўкараняецца не для таго, каб справаздачы былі прыгожымі, а каб людзям жылося лепш. Кіраўнікі тых гаспадарак, якія ў перадавіках, сёння маюць магчымасць і самі дзяліцца вопытам — на больш высокай прыступцы. Дарэчы, сённяшні кіраўнік Гомельскай вобласці Уладзімір Дворнік яшчэ некалькі гадоў таму ўзначальваў саўгас-камбінат «Зара».

Між тым, гэта далёка не адзіная гаспадарка ў вобласці, поспехі якой з'яўляюцца прыкладам для іншых.

— У сельскагаспадарчым комплексе «Ляскавічы» дзяржаўнай прыродаахоўнай установы «Нацыянальны парк «Прыпяцкі» летась уведзены ў строй новы комплекс робатадаення на 450 галоў жывёлы, — расказвае старшыня Ляскавіцкага сельвыканкама Вольга Янкевіч. — Пабудаваны і сучасны зернесушыльны комплекс. Хутка будзе падводзіцца газ у дамы для насельніцтва аграгарадка Ляскавічы. Зараз выдзелена 30 млн. рублёў на гэтыя мэты з абласнога бюджэту.

Наваселле справілі і восем сем'яў спецыялістаў. Ім службовае жыллё ў выглядзе камфартабельных дамоў прадастаўлена на новай вуліцы, якую назвалі Фестывальная. У планах — працягваць будавацца. Самае цікавае, што не толькі ў аграгарадку з сучаснай інфраструктурай зусім не засталося закінутых безгаспадарчых дамоў. У вёсках побач, што ўздоўж Прыпяці, — таксама. Вольга Янкевіч расказвае, што прыпяцкія краявіды вельмі прываблівають у першую чаргу жыхароў Мінска. Можа, таму за апошні год тут значна падаражэлі сядзібы. Як прыкмета дабрабыту — спадарожнікавыя талеркі на прыватных дамах, якіх стала прыкметна больш.

Нягледзячы на тое, што Гомельшчына знаходзіцца ў зоне рызыкоўнага земляробства, яе магчымасцяў хопіць, каб задаволіць патрэбы насельніцтва, перапрацоўчай галіны, і павялічваць экспарт, — упэўнены аграрнікі. Летась апошні паказчык вырас у вобласці амаль на 30% і склаў больш за $340 мільёнаў.

Дарэчы, сёлета будуць здадзены і 22 новыя малочнатаварныя фермы. Палова аб'ектаў знаходзіцца ў стадыі 50-працэнтнай гатоўнасці. Па словах эканамістаў, тэрмін акупляльнасці кожнай МТФ складзе 7—10 гадоў. У ліку першых завершыцца будаўніцтва самай буйной фермы ў населеным пункце Казергань ААТ «Тураўшчына» Жыткавіцкага раёна, якая разлічана на 1050 галоў дойнага статка. Акрамя таго, на Гомельшчыне сёлета плануецца правесці рэканструкцыю 190 МТФ. Гэтыя аб'екты будуць рэканструяваны пад тэхналогію ўтрымання жывёлы з замкнёным цыклам вытворчасці малака.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

Яўген ВОРСІН:

# «МЫ РЫХТУЕМСЯ ДА ХАКЕЙНАГА ЧЭМПІЯНАТУ СВЕТУ-2014 І ПРАВЯДЗЁМ ЯГО ДАСТОЙНА»

**У 2013 і 2014 гадах Беларусь прымае два чэмпіянаты свету — па веласпорце на трэку і па хакеі. Як краіна і яе сталіца Мінск рыхтуюцца да гэтых падзей, расказалі старшыня федэрацыі хакея Беларусі Яўген Ворсін і выканаўчы дырэктар Беларускай асацыяцыі веласіпеднага спорту Аляксей Іваноў.**

— Падрыхтоўку да чэмпіянату свету-2014 мы вядзём з 2009 года, і ў нас засталося зусім няшмат часу. Зараз ідзе планавая работа. Для падрыхтоўкі да чэмпіянату свету нашымі галоўнымі абавязкамі было пабудаваць «Чыжоўка-Арэну» і стварыць інфраструктуру, якая забяспечыць прыём гасцей, — расказаў Яўген Ворсін.

Ён паведаміў, што, згодна з планам, «Чыжоўка-Арэна» будзе ўведзена ў строй да лета наступнага года, а ў канцы 2013 года там пройдуць тэставыя міжнародныя спаборніцтвы, на якія будуць запрошаны «топавыя каманды».

Мяркуецца, што падчас чэмпіянату-2014 нашу сталіцу наведае каля 20 тысяч замежных гасцей. У Мінску завяршаецца будаўніцтва і рэканструкцыя гасцініц, кавярняў і рэстаранаў. І гэтыя пытанні вырашаюцца не толькі на пасяджэнні рэспубліканскага аргкамітэта, але і ў Мінгарвыканкаме.

— Штодзённа Мінгарвыканкам дае справаздачы аб ходзе работ, якія тычацца пытанняў размяшчэння, харчавання, транспарту. І калі меркаваць па гэтай інфармацыі, то ўсё дастаткова перспектыўна, зрываў і затрымак не назіраецца. Да мая 2014 года наша краіна будзе гатова прыняць чэмпіянат, — рэзюмаваў Яўген Ворсін.

Старшыня федэрацыі хакея пракаментаваў пытанне і з пераносам чэмпіянату свету ў іншую краіну. У прыватнасці, Яўген Ворсін заявіў, што яму нічога не вядома аб унясенні ў парадак дня майскага кангрэса Міжнароднай федэрацыі хакея пытання аб пераносе чэмпіянату свету з Мінска:

— Я не ведаю, са спасылкай на якія крыніцы з'яўляецца такая інфармацыя. Апошнія навіны вы ведаеце: Еўрапарламент прымае рэзалюцыю, просіць свае нацыянальныя хакейныя федэрацыі неяк адрэагаваць. Ну, просіць, дык і просіць. Гэта праца Еўрапарламента, яны шмат пра што просяць. Мы рыхтуемся да чэмпіянату свету і правядзём яго дастойна. Як ставяцца да гэтага калегі з краін Еўропы? Станоўча. Літаральна ўчора мы размаўлялі з прадстаўнікамі Швецыі, якія прыязджалі да нас на матчы Еўравыкліку. Уражанні ў іх выдатныя, яны выразілі нам падзяку ад імя сваіх хакеістаў і трэнераў за добры прыём, размяшчэнне і арганізацыю паядынкаў. І, вядома, яны кажуць, што будуць рады прыехаць да нас на чэмпіянат свету, — заявіў Яўген Ворсін.

Аляксей Іваноў паведаміў, што падчас нядаўняга чэмпіянату свету па велатрэку, які прымаў аўстралійскі Мельбурн, прайшла прэзентацыя планетарнага першынства, які налета прыме Мінск. На ёй па традыцыі была прадстаўлена наша краіна, спартыўная інфраструктура (у прыватнасці, «Мінск-Арэна»), нашы спартыўныя дасягненні (у тым ліку ў веласпорце). Напрыканцы васьміразовая чэмпіёнка свету Наталля Цылінская звярнулася з відэазваротам, пасля чаго кожны атрымаў сувенір — кавалачак майкі чэмпіёнкі з яе аўтографам.

— Зараз у Мельбурне плюс 20, а праз год у Мінску можа быць мінус 20. Але ніхто гэтага не адчуе: Беларусь умее цёпла прымаць гасцей, — такую выснову зрабілі прадстаўнікі Міжнароднага саюза веласіпеднага спорту, перадаючы эстафету Мінску. Трэба сказаць, што на прэзентацыі прысутнічалі прадстаўнікі ўсіх краін, у тым ліку і еўрапейскіх. Яны прыязна ставяцца да паездкі ў Беларусь у наступным годзе, — паведаміў Аляксей Іваноў.

Напрыканцы ён падвёў вынікі выступлення нашай каманды на чэмпіянаце свету:

— Так, у Мельбурне мы паказалі сціплыя вынікі, але мы ішлі на гэта свядома. Панарына раней атрымала дзве ліцэнзіі, а ў каманднай гонцы праследавання нашы дзяўчаты занялі шостае месца і заваявалі ліцэнзію. Такім чынам, у нас тры ліцэнзіі на трэку і столькі ж на шашы — не так і дрэнна для веласпорту. Гэта дазваляе спадзявацца, прынамсі, на два медалі ў веласпорце на Алімпійскіх гульнях.

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

# ЧАМУ КАМУНАЛЬНІКІ НЕ ЛЮБЯЦЬ ЛІЧБУ 2012?

**Цудоўная красавіцкая раніца для карэспандэнтаў «Звязды» на гэты раз пачалася не з водару кавы. Давялося падыхаць свежай фарбай. Не, мы не змянілі прафесіі. Проста вырашылі пацікавіцца, як прыбіраюць «аўтографы», пакінутыя кімсьці ноччу на сценах дамоў.**

«Уладанні» КУП ЖЭУ №72, дзе згадзіліся расказаць і паказаць усе нюансы працэсу змагання з так званымі «несанкцыянаванымі надпісамі», знаходзяцца ў цэнтры горада, недалёка ад плошчы Перамогі. Раён чамусьці надта ўпадабалі аматары роспісу сцен.

— Надпісы гэтыя з'яўляюцца звычайна ноччу, калі намаляваць іх ніхто не перашкаджае, — расказвае дырэктар КУП ЖЭУ №72 Аляксандр Малашчанка. — Зафарбоўваць іх даводзіцца пастаянна, толькі што зімой нашы «мастакі» крыху менш актыўныя.

Для горада гэтае пытанне сапраўды балючае. Толькі летась малюнкі і надпісы, зробленыя фарбамі з балончыкаў і маркерамі, былі зафарбаваны на 4542 жылых дамах. Каштавала гэта ўсё 103,4 мільёна рублёў.

Аляксандр Малашчанка расказаў, што надпісы — справа стабільная, хоць і з'яўляюцца яны часцей за ўсё ў розных месцах. Праўда, ёсць некалькі дамоў недалёка ад Камароўскага рынка, дзе на адных і тых жа сценах шкоднікі пішуць ледзь не штоноч.

Каб зафарбаваць адзін квадратны метр сапсаванай сцяны, патрэбна 11-12 тысяч рублёў. Грошы, здаецца, не надта вялікія. Але ўсё б нічога, калі б не трэба было штораніцы аддаваць сродкі не на адзін вось такі «квадратны метр».

— Калі паверхня пафарбаваная ці пабеленая, надпісы даводзіцца замалёўваць тым жа колерам. А вось на плітцы ці мармуры, дзе паверхня не такая далікатная, добра дапамагае растваральнік, — Аляксандр Малашчанка вядзе нас да аднаго з дамоў на праспекце Незалежнасці.

На дзвярах пад'езда чорнай фарбай намалявана некалькі лацінскіх літар. З гэтымі будуць «змагацца» з дапамогай фарбы і пэндзля. Надпіс, відавочна, яшчэ свежы. Маляр Наталля Гарнашэвіч расказала, што працуе ўжо васямнаццаць гадоў, але так часта зафарбоўваць «аўтографы» даводзіцца толькі апошніх гадоў сем:

— Кожны дзень нешта прыбіраю. А пішуць што? Ой, я і не разумею. Бязглуздзіцу розную. Цяпер чамусьці «хітом» у іх стала лічба 2012. Проста паўсюдна. І чаму яе так часта трэба маляваць?


1.


2.


3.


4.

Фота Надзеі БУЖАН і з інтэрнэту.

## ЦІКАВЫЯ ФАКТЫ:

✓ Сёлета ў сталіцы толькі ў студзені несанкцыянаваныя надпісы былі зафарбаваны на 188 будынках, што каштавала гарадскім уладам 6,1 мільёна рублёў

✓ Плошча сапсаваных фрагментаў сцен, якія штогод зафарбоўваюць камунальнікі, адпавядае памеру амаль двух футбольных палёў

✓ Найбольш «пакутуюць» ад несанкцыянаваных надпісаў будынкі Першамайскага і Савецкага раёнаў сталіцы. На барацьбу з размаляванымі сценамі летась у Першамайскім раёне затрацілі 16,6 мільёна рублёў, а ў Савецкім — 18,8 мільёна рублёў

Аказваецца, ні прызнанняў у каханні, ні прыгожых і сапраўды вартых малюнкаў, ні нават непрыстойных слоў хаваць пад слоем фарбы Наталлі не даводзілася. Тых, хто забяспечвае працай, пакідаючы на сценах надпісы, жанчына не сустракала таксама ніколі. Увогуле, гэтыя асобы вельмі загадкавыя і няўлоўныя. Ноччу малююць яны, днём — супрацоўнікі камунальнай гаспадаркі.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ.**

## ІНШЫЯ СПОСАБЫ САПСАВАЦЬ ГОРАД

**Здабываюць сабе славу Герастрата, не толькі пакідаючы аўтографы на сценах.**

**Топ-3 ад беларускіх вандалаў:**

✓ У пачатку леташняга верасня жыхароў Брэста ўзрушыла неверагодная навіна: на вуліцы Савецкай, любімым месцы для прагулак у многіх брастаўчан, нейкі шкоднік паламаў маладыя дрэўцы. Алея з 29 дрэў была поўнасцю знішчана (фота 1).

✓ Ва ўрочышчы Гай каля Баранавічаў у лютым гэтага года нехта паквапіўся на медзь. І ўсё б нічога, калі б аматары каляровых металаў не вырашылі «адшчыпнуць» кавалачак ад помніка расстраляным ва ўрочышчы падчас вайны чэшскім яўрэям (фота 2).

✓ Некаторыя жыхары Партызанскага раёна сталіцы запомнілі сёлетні пачатак сакавіка як час хадзіць пешшу. Невядомыя сапсавалі больш за 15 ліфтаў у дамах раёна. Ва ўсіх выпадках кралі ліфтавую катушку, якая зроблена з медзі і сталі (фота 3).

ДАРЭЧЫ

## А калі графіці — ды ў творчае рэчышча?!.

**Дзяржаўная інспекцыя аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь запрасіла ўсіх ахвотных узяць удзел у... размалёўцы ў стылі графіці сваіх унутраных памяшканняў! Гаворка ідзе пра будынак цэнтральнага апарату, які месціцца ў Мінску па адрасе: вуліца Харкаўская, 17.**

Тэматыка малюнкаў — прыгажосць беларускай прыроды, беражлівае стаўленне да прыродных багаццяў нашай краіны, прыродаахоўная дзейнасць Дзяржінспекцыі. Узяць удзел у конкурсе змогуць любыя ахвотныя ва ўзросце ад 18 гадоў. Прымаюцца і індывідуальныя, і калектыўныя заяўкі. Творчы конкурс графіці будзе праходзіць у два этапы. Па 20 красавіка будзе весціся прыём эскізаў і заявак на ўдзел (пры вялікай колькасці пададзеных заявак адбор прэтэндэнтаў можа скончыцца і раней). Пераможцам першага этапу будзе дадзена магчымасць рэалізаваць свае эскізы на ўнутраных агароджах, усталяваных у Дзяржінспекцыі. Другі этап конкурсу мяркуецца правесці 25-27 красавіка. Па яго выніках пераможцы за першае, другое, трэцяе месцы атрымаюць каштоўныя прызы ад арганізатараў. Па рашэнні конкурснай камісіі могуць быць вызначаны дадатковыя, спецыяльныя і заахвочвальныя прызы. Мэты і задачы конкурсу — выяўленне і падтрымка творчай моладзі, стварэнне ўмоў для творчай жа яе самарэалізацыі, а таксама папулярызацыя сярод грамадзян прыродаахоўнай дзейнасці Дзяржінспекцыі і беражлівага стаўлення да прыродных багаццяў Беларусі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Дарагія нашы любыя **Галіна Мікалаеўна, Віктар Лявонцьевіч КАЗЛОЎСКІЯ** з в. Жукаў-Барок Стаўбцоўскага раёна! Прыміце нашы віншаванні і пажаданні ад усёй душы: міру і згоды, утульнасці і цяпла ў доме, любові родных, сяброў і блізкіх, шчасця і дабра. І няхай здароўе будзе моцным, а сэрца вечна маладым.

**З любоўю мама, Сяргей, Ганна, пляменнікі Дзяніс, Юлія, сястра Наталля, швагер Ігар, дзеці Святлана і Уладзік.**

У НАСТУПНЫМ НУМАРЫ



**Праваслаўныя ўсяго свету рыхтуюцца да вялікага і светлага свята — Пасхі. У Свята-Елізавецінскім манастыры ўжо некалькі дзён пякуць кулічы і фарбуюць яйкі.**

## ПАКУПНІКІ ЎПАДАБАЛІ БЯРОЗАВІК-СЫРЭЦ

**Нарыхтоўка бярозавіку ў лясгасах краіны ўступіла ў актыўную «фазу»: паводле аператыўнай інфармацыі Мінлясгаса, яго нарыхтавалі ўжо каля 15 тысяч тон.**

Усяго, нагадаем, сёлета плануецца нарыхтаваць гэтага прыроднага напою не менш за 25 тысяч тон. Займацца гэтым могуць і грамадзяне, але толькі на тых участках лесу, якія вызначаныя лясніцтвамі, і пры захаванні адпаведных правілаў. Атрымаць патрэбную інфармацыю пра такія ўчасткі фізічныя асобы могуць у лясніцтвах па месцы жыхарства.

Акрамя таго, расказалі «Звяздзе» ў прэс-службе міністэрства, некаторыя лясгасы, пераважна ў Мінскай вобласці, рэалізуюць бярозавы сок-сырэц у ёмістасцях па 5 літраў — на гарадскіх рынках. Спецыялісты лясгасаў тлумачаць пакупнікам, што набыты прадукт трэба перапрацаваць на працягу сутак. Вынікі першых дзён продажу соку-сырцу сведчаць, што гэтая прадукцыя знаходзіць свайго пакупніка: увесь прывезены на рынкі бярозавік раскупляецца.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**






Даты | Падзеі | Людзі

**1492** год — 520 гадоў таму ў Гальшанах — феадальнай вотчыне князёў Гальшанскіх, якія доўгі час займалі высокія пасады ў ВКЛ, адбыўся сход па выбары кандыдатаў на вялікакняжаскі трон. Першае згадванне Гальшанскага княства з цэнтрам у Гальшанах (цяпер вёска ў Ашмянскім раёне Гродзенскай вобласці) з'явілася ў пісьмовых крыніцах у 1280 годзе. У XVII ст. там пабудаваны Гальшанскі палац, помнік палацава-замкавай архітэктуры, і Гальшанскі касцёл францысканцаў, помнік архітэктуры барока. У сярэдзіне XVI ст. большасць радавых уладанняў Гальшанскіх перайшло ва ўласнасць прадстаўнікоў роду Сапегаў. Менавіта таму сучасны герб і сцяг вёскі Гальшаны створаны на аснове двух прыватнаўласніцкіх гербаў — «Гіпацэнтаўр» (род Гальшанскіх) і «Ліс» (род Сапегаў). Герб і сцяг зацверджаны Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2006 года.

**1204** год — удзельнікі 4-га крыжовага паходу захапілі галоўны горад Візантыі Канстанцінопаль і абвясцілі яго сталіцай Лацінскай імперыі. Наогул, у тым годзе ладзіўся чарговы паход супраць мусульман, якія не хацелі аддаваць хрысціянам Іерусалім і Труну Гасподнюю. Папа Рымскі Інакенцій III заклікаў усіх еўрапейскіх манархаў паслаць свае войскі ў Святую зямлю. Пакрыўдзіўшы візантыйскага імператара Аляксея III, якога мала цікавіла святая справа, Інакенцій заадно прапанаваў яму правесці перамовы па аб'яднанні дзвюх хрысціянскіх цэркваў — Заходняй і Усходняй, на чале якіх ён бачыў, вядома ж, сябе. У Візантыі ж у гэты час ішла барацьба за ўладу. І адзін з прэтэндэнтаў на карону, Ісак II, паабяцаў, што не толькі выканае ўсе гэтыя патрабаванні, але яшчэ і грошай дасць, калі святое войска дапаможа яму ўзысці на прастол. Яму дапамаглі, але грошай Ісак не даў. І тады раз'юшаныя крыжаносцы вырашылі ўзяць іх самастойна. На гэтым 4-ты крыжовы паход і скончыўся.



**1938** год — нарадзіўся (г. Слаўгарад) Генадзь Антонавіч Говар, беларускі фізік. Доктар фізіка-матэматычных навук (1991), прафесар (1994). З 1966 года — у Інстытуце фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў НАН Беларусі. Аўтар навуковых прац па структурных і магнітных фазавых пераўтварэннях у цвёрдым целе, распрацоўцы новых магнітных матэрыялаў. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (2004).

Было сказана

Кузьма ЧОРНЫ (1900—1944), беларускі пісьменнік:

*«Кожны пражыты дзень адкідае тое, што ёсць, і набліжае тое, што будзе».*

Склаў Андрэй МІХАЙЛАЎ.



ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

**Па гарызанталі:** Вышыўка. Чаканка. Вагон. Пано. Гнус. Шаша. Румба. Друз. Рында. Вяз. Зона. Крона. Руб. Язь. Аск. Сані. Марак. Каракум. Эра. Адоба. Поні. Рымар. Палац. Пята. Дыярама. Мурог. Варатар. Лучавіч. **Па вертыкалі:** Кандуктар. Мэр. Лубок. Сары. Арам. Варона. Аладка. «Ася». Ікар. Айва. Зебу. Пляма. Ангар. Соня. Руд. Гон. Твар. Уюн. Каза. Мол. Конус. Рагу. Разьба. Стала. Маньяк. Кол. Куна. Вітраж. Лье. Міцкевіч.

# СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.13 | 20.08 | 13.55 |
| Віцебск — | 6.00 | 20.01 | 14.01 |
| Магілёў — | 6.03 | 19.58 | 13.55 |
| Гомель — | 6.03 | 19.52 | 13.49 |
| Гродна — | 6.28 | 20.23 | 13.55 |
| Брэст — | 6.32 | 20.20 | 13.48 |

**Месяц**

***Апошняя квадра ў 13.50. Месяц у сузор'і Казярога.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Марыі, Апалона, Веньяміна, Івана, Інакенція, Іоны, Іпата.*
***К.*** *Іды, Юстыны, Марціна, Пшэмыслава.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




УСМІХНЕМСЯ

**Стагадовыя ўгодкі з дня крушэння «Тытаніка» будуць адзначаны вандраваннем на месца, дзе затануў карабель. Больш за тысячу пасажыраў адплывуць у нядзелю ад брытанскага порта Саўтгемптан. Садружнасць Айсбергаў Грэнландыі высылае на мерапрыемства свайго прадстаўніка.**

Госці патрэбныя для таго, каб час ад часу наводзіць у доме парадак.

**Двое сяброў.**
**— Вось, цешча памерла.**
**— Ды ты што? Якое гора... а што ў яе было?**
**— Ды так, нічога асаблівага. Канапа, шафа...**

Айцец Фёдар ужо тры гады збірае ахвяраванні на капліцу, але пакуль хапіла толькі на BMW.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, А. КЛЯШЧУК, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК (намеснік галоўнага рэдактара), С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне»— 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Баранавічах: 47 71 94, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03.

http://www.zviazda.by; ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: rek@zvyazda.minsk.by

e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 30.015. Індэкс 63850. Зак. № 1650.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 12 красавіка 2012 года.